“Мала на руках не мець аковаў,
Што з той хвалі, як душа маўчыць?
Трэба роднай, спадчыннаю мовай,
Як бясцэнным дарам даражыць.”

Так шчыра, спавядальна выказваецца пра мову як бясцэнны духоўны скарб Тамара Міхайлаўна Мазур, паэтэса, наша зямлячка, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, якая і завітала ў госці ў сваю родную школу № 1 г.п. Рось якраз 21 лютага падчас Міжнароднага дня роднай мовы.

Паэт – гэта знаўца чалавечых душ, які трымае ў сваіх далонях свет і цэлы Сусвет. Менавіта мастацтва слова здольна ўскалыхнуць патаемныя струны чалавечай душы, дапамагае ўзняцца на недасягальную вышыню.

Падчас даверлівай размовы з паэтэсай мы атрымалі сапраўдныя ўрокі духоўнасці, вернасці спадчыннаму роднаму слову, беражлівых адносін да яго. Уласная трывога паэтэсы за лёс роднай мовы адгукнулася ў сэрцы кожнага з нас.

“Боль мой - у сэрцы, боль – гэта споведзь
Боль – гэта крыж нябес.
Так за Радзіму выношваю боязь,
Нібы за ўласны лёс.”

А як духоўна, эмацыянальна, узрушана, паэтэса кажа аб уласным, творчым і грамадзянскім абавязку кожнага з нас – берагчы духоўнаю спадчыну Радзімы, сваіх продкаў.

І па шчырым прызнанні творцы, менавіта родная старонка, малая радзіма, прытулак светлых мар і надзей.

Разам з паважанай госцяй падчас наведвання гісторыка – краязнаўчага музея нашай школы, дзе створана экспазіцыя ў гонар знакамітай зямлячкі “Ведай нашых”, мы паўней пазнаеміліся з каштоўнай спадчынай Т.М. Мазур.

А на развітанне яе словы, як напамінак, а больш як абавязак для нас, кожнага свядомага беларуса.

“Больш жадаць нічога не бяруся
Многа – без граху і без спакус,
Мала нарадзіцца бедарусам,
Неабходна ЖЫЦЬ як БЕЛАРУС.”